

Нефармат

# БАБА ГАННА

Пабывала на малой радзіме, наведала магілы бацькоў, бабуль, дзядоў. А потым гэты спектакль здарыўся — «Радзіва «Прудок», які працуе за жывое, нагадаў пра родны куток. З гадамі ўсё часцей успамінаю сваю бабулю Ганну... Не ведаю, чаму, але з усіх сваякоў старэйшага пакалення яна падаецца мне найбольш духоўна блізкім чалавекам.

Яна памерла, калі я была на апошнім курсе ўніверсітэта. І колькі жыву, буду сябе дакараць, што па-сутнасці ніколі не распытвала пра яе жыццё. Таму ў памяці засталіся нейкія кароткія, нібы вырваныя з кантэксту звесткі, якія бабуля сама выпадкова прамаўляла. Бо пра сябе яна расказвала надзвычай мала, па характары вельмі стрыманая, ніколі не ўдзяляла ўвагі ўласнай персоне, у яе заўсёды на першым плане былі іншыя. Ведаю, што вырасла сіратой, што дзед быў таксама з бедных, і першы ўласны кавалак зямлі яны купілі перад 39-м годам...

Баба Ганна рэдка згадвала аб тым, як перажылі вайну, толькі адночы прывяла такі прыклад: «Каб хто немцам данёс, што дзед да вайны ўступіў у партыю, а пасля вызвалення Саветам, што наш сусед Ткач быў старастам пры немцах, то сёння не было б ніводнага. А так, бачыш, якія ў нас людзі ў Навасёлках». Факт. Калі ў іхняй вёсцы нешта ў некага прападала, ведалі, што злодзей не з мясцовых, чужы.

З далечыні гадоў гэтая вёска бачыцца асаблівай сваімі спакоем і добразычлівасцю. Спакоем, бо яна ўбаку ад дарогі, тут машына наогул рэдка праязджала, і жыхары, ужо тады спрэс пажылыя, запомніліся спакойнымі, разважлівымі. На вуліцы, дзе я вырасла, такога не было. А можа гэта стойкае ўражанне дзяцінства ідзе ад бабулінай хаты, дзе было добра, бо там чакалі і любілі? Адным з першых успамінаў дзяцінства, звязаных з бабінай хатай, сталі карычневыя штаны ў дробненькі малюнак, якія баба Ганна пашыла на сваёй машынцы за паўгадзіны ці нават менш. Мне было гады чатыры, калі бацькі недзе ехалі па справах, а мяне адправілі да дзеда з бабай на цэлы дзень. Хоць стаяла лета, але дзень, відаць, выдаўся не самы спякотны. І бабуля завохкала: «Што ж яны дзіця прывялі ў адной сукенцы!?» Потым адкрыла машынку, дастала з цёмнай шафы кавалак тканіны і пашыла штонікі на гумцы, унізе таксама ўставіла гумкі, выйшлі гэткія шаравары, як апранаюць артысты з танцавальных ансамбляў. А мне ў іх стала зручна коўзацца па двары і ў хаце на падлозе. Я да гэтай пары помню тую карычневую шафу з фанернымі дзвярыма, не такую, трохстворкавую з люстэркам, якія былі ў многіх вясковых хатах, а даўнейшай работы, цёмную. Яна стаяла паўпустая, там віселі хіба са дзве яе выхадныя сукенкі, дзедаў пінжак. Бялізна складвалася ў іншым месцы, у куфар. А сукенкі яна шыла сама, шыла многім у вёсцы. Яшчэ рабіла карункавыя фіранкі на вокны, калі з дапамогай дзірачак на белым палатне калі вырабляюцца розныя ўзоры і арнаменты. Прырода не надзяліла мяне бабулінымі здольнасцямі. На жаль.

...У школьныя гады я старалася дапамагаць бабулі. Дзеда ўжо не было. Адпасвіць карову (у нас казалі вочарадзь) ёй было цяжка, я пасвіла разам з суседкай — бабай Воляй. Было цікава, бо баба Воля ведала процьму песень, частушак, показак, прымавак, была вельмі вясёлая і гумарная жанчына. А калі бабе Ганне стала зусім не пад сілу, і карову ўсё ж прадалі, яна купіла ў падарунак мне гадзіннік, першы ў маім жыцці. Тады я была ў восьмым класе. А той квадратны гадзіннік мінскага завода хаваю ў кардонцы сярод розных сямейных рэліквій.

Яшчэ запомнілася бабуліна: «Як добра глядзець, калі нехта робіць». Гэта яна казала, седзячы ў куточку, калі я мыла падлогу. Бывала, прыйду, так папрыбіраю ў кухні, што яна потым месяц не можа знайсці нейкую міску ці каструлю. Маме потым скажа, а мне ніколі нават слова, каб хоць не пакрыўдзіць. Да ўласных слоў яна была заўсёды ўважлівая. А калі памерла, і сабраліся яе равесніцы, то сказалі, што яна адна з кабет, мабыць, на ўсю вёску, якая за жыццё не пасварылася нават з суседкай за курыцу, калі тая ўлезла ў агарод. Не магу ўявіць, як яна сварыцца. Нешта ўсё ж было арыстакратычнае ў гэтай вясковай сіраты, якая сваіх бацькоў нават не памятала.

За ўсё жыццё бабуля пабывала ў вялікім горадзе аднойчы. Яе вазілі на нейкае мерапрыемства ў Брэст у ліку калгасных перадавікоў. А калі атрымала пенсію, адразу было 12 рублёў, гаварыла, што жыць цяпер вельмі добра: ты нічога не робіш, а табе плацяць. І толькі раз згадала такі момант, калі дзеці ў яе былі малыя, а есці ў хаце не было чаго. Мусіць, яшчэ перад вайною.

А ў маім дзяцінстве ў яе заўсёды быў прыхаваны пачастунак. Асабліва я любіла, калі ў садзе паспявалі чарэшні. Вялікая чарэшня расла ў двары, недалёка ад ганка. Не ведаю, ці ёсць яна цяпер. Дзядзька прадаў бабуліну хату дачніку з горада. Перад тым забраў усе здымкі са сцен. Цяпер і дзядзькі з цёткай няма, а іх дзецям тыя старыя фота аказаліся нецікавымі, недзе прапалі. І чаму я зусім не распытвала бабу Ганну пра яе жыццё ў маладосці? Хто цяпер раскажа?

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.11 | 21.20 | 16.09 |
| Віцебск — | 4.54 | 21.16 | 16.22 |
| Магілёў — | 5.01 | 21.10 | 16.09 |
| Гомель — | 5.05 | 21.00 | 15.55 |
| Гродна — | 5.28 | 21.34 | 16.06 |
| Брэст — | 5.36 | 21.28 | 15.52 |

**Месяц**

*Апошняя квадра ў 4.17. Месяц у сузор'і Цяльца.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Арсенія, Гаўрылы, Івана, Міхаіла, Сымона, Фёдара.*
***К.*** *Валянціны, Валянціна, Міхала, Рудольфа, Якуба.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**25 ЛІПЕНЯ**

У краіне

**1853** год — Мінскае губернскае праўленне і Мінская гарадская дума, разгледзеўшы пытанне «Аб стварэнні пажарнай часці ў Мінску», зацвердзіла каштарыс расходаў на ўтрыманне пажарнай часці ў складзе 51 чалавека. Менавіта з гэтага моманту пачынаецца гісторыя прафесійнай пажарнай службы Беларусі. У 1853 годзе былі арганізаваны пажарныя брыгады ў Віцебску, Магілёве і іншых беларускіх гарадах. У склад першай мінскай брыгады ўваходзілі брандмайстар, два яго намеснікі і 48 пажарных. У 1890-я ў Мінску меліся ўжо дзве дружыны: гарадская пажарная каманда і Мінскае вольна-пажарнае таварыства.

**1924** год — Прэзідыумам ЦВК БССР зацверджаны ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР, найвышэйшая дзяржаўная ўзнагарода Беларускай ССР у 1924—1933 гадах. Ордэнам узнагароджваліся асобныя грамадзяне, прадпрыемствы, установы, арганізацыі і калектывы працоўных за асаблівыя заслугі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва і абароны краіны. Скульптурна-графічны праект ордэна распрацаваў мастак Г. Змудзінскі. Уручэнне ордэна (як і ордэнаў іншых саюзных рэспублік) было спынена пастановай Прэзідыума ЦВК СССР ад 24 красавіка 1933 года ў сувязі з увядзеннем адзінай агульнасаюзнай сістэмы ўзнагарод.

**1949** год — нарадзіўся (вёска Паўстынь Слуцкага раёна) Валерый Іванавіч Жук, беларускі мастацтвазнавец, доктар мастацтвазнаўства. З 1976 года — у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. Даследуе выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі. Аўтар манаграфій «Сучасная беларуская кераміка. Тэндэнцыі развіцця», «Традыцыі і наватарства ў беларускім савецкім дэкаратыўна-прыкладным мастацтве» і іншых. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1954** год — нарадзілася (вёска Мазуршчына Салігорскага раёна) Валянціна Аколава, беларуская паэтэса, перакладчыца. Аўтар зборнікаў паэзіі «За тым лугам зеляненькім», «Вяртанне ў заўтра», «Я люблю сваю Белую Русь», а таксама паэмып'есы «Палачанка Інгрэна, альбо Вяртанне Скарыны». Паасобныя вершы пакладзены на музыку. Паэзія Валянціны Аколавай вызначаецца лірызмам, спавядальнасцю, сувяззю з фальклорам (выкарыстанне фальклорных матываў і вобразаў, народна-песенная стылістыкі). Працавала як перакладчыца з рускай, украінскай і славацкай моў. Памерла ў 2013 годзе.

У свеце

**1929** год — нарадзіўся Васіль Макаравіч Шукшын, расійскі пісьменнік, кінарэжысёр, сцэнарыст, акцёр. Аўтар кніг «Характары», «Вясковыя жыхары», «Там удалечыні» і іншых. Здымаўся ў фільмах: «Печкі-лавачкі», «Каліна чырвоная», «Яны змагаліся за Радзіму!» ды іншых. Памёр у 1974 годзе.



**1947** год — у Празе адбыўся I Сусветны фестываль моладзі, які паклаў пачатак сусветнаму фестывальнаму руху.

## УСМІХНЕМСЯ

**— Як ты адкрыў купальны сезон?**

**— З дапамогай штопара.**

Ніколі, чуеце, ніколі не піце каву на рабоце раніцай. Да абеду не засняце.

**У аптэцы:**

**— У вас сродак для вырошчвання валасоў ёсць?**

**— Ёсць.**

**— Добры?**

**— Вельмі! Вунь бачыце за касай — чалавек з вусамі? Гэта мая жонка, яна проста паспрабавала корак з бутэлечкі зубамі адкруціць...**

Яшчэ ў дзяцінстве мама спрабавала мяне атруціць. Або, як гэта яна сама называла, «малочны суп».




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2348.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 24 ліпеня 2019 года.